# АБАРОНА ЎНУТРАНАГА РЫНКУ Ў ГАЛІНЕ АХОВЫ ПРАВОЎ НА АБ’ЕКТЫ ІУ КНР І ЕС ЯК МАГЧЫМЫ АРЫЕНЦІР ДЛЯ ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНЫХ МЕР ЕАЭС

**Д. А. Белая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*Мінск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*

У сучасным міжнародным гандлі адным з ключавых аспектаў з’яўляецца менавіта інтэлектуальная ўласнасць. Эфектыўнасць і ўзгодненасць сістэмы яе абароны – гэта паказчык паспяховай дзейнасці мытных органаў і дзяржавы (альбо саюза дзяржаў). Правапрымяняльныя меры і іх вынікі ў сферы інтэлектуальнай уласнасці сталі важным аспектам для эфектыўнай абароны правоў спажыўцоў і вытворцаў, а іх міжнародны характар сведчыць пра неабходнасць прадухілення парушэнняў правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці. У дадзеным артыкуле разглядаюцца правапрымяняльныя практыкі як Кітайскай Народнай Рэспублікі, так і Еўрапейскага саюза з мэтай паказаць іх паспяховасць і магчымае прымяненне ў будучыні у дзяржавах-членах Еўразійскага эканамічнага саюза.

***Ключавыя словы:*** аб’екты інтэлектуальнай уласнасці; процідзеянне кантрафакту; унутраны рынак; Еўрапейскі саюз; Кітайская Народная Рэспубліка; эканамічная бяспека; Еўразійскі эканамічны саюз; правапрымяняльныя меры.

# CHINA’S AND EU’S INTERNAL MARKET PROTECTION OF IP RIGHTS AS A POSSIBLE BENCHMARK FOR EAEU LAW-ENFORCEMENT MEASURES

**D. A. Belaya**

*Belarusian State University,*
*Minsk, Belarus, belayaa_1903@mail.ru*

One of the key aspects of modern international trade is intellectual property. The effectiveness and coherence of the system of its protection is an indicator of the success of customs authorities and the government (or an alliance). Enforcement measures and their results in the field of intellectual property have become an important aspect for the effective protection of the rights of consumers and producers, and their international character demonstrates the need to prevent infringement of intellectual property rights. This article examines the enforcement practices of both the People's Republic of China and the European Union in order to demonstrate their effectiveness and possible future application in the member states of the Eurasian Economic Union.

***Keywords:*** intellectual property; combating counterfeiting; internal market; the European Union; People's Republic of China; economic security; the Eurasian Economic Union; law enforcement measures.

Праз павелічэнне значнасці інтэлектуальнай уласнасці ў эканоміцы, заснаванай на ведах, распаўсюджваюцца таксама і неспрыяльныя наступствы ў выглядзе гандлю кантрафактнымі і пірацкімі таварамі, пад уздзеянне якіх трапляюць усе. Важна развіваць і ўкараняць эфектыўныя стратэгіі па барацьбе з парушэннямі правоў інтэлектуальнай уласнасці (далей – ІУ), пры якіх павінны ўлічвацца як глабальныя маштабы патокаў кантрафакту, так і канкрэтныя схемы, што сёння выкарыстоўваюцца зламыснікамі. Менавіта таму адпаведная інфармацыя аб маштабах рэалізацыі і тэндэнцыях перамяшчэння кантрафакту ў канкрэтных краінах і міжнародных аб'яднаннях мае вырашальнае значэнне для разумення прыроды праблемы, распрацоўкі і рэалізацыі эфектыўнай палітыкі і мер процідзеяння.

Што тычыцца вопыту Кітайскай Народнай Рэспублікі (далей – КНР), перамяшчэнне кантрафактных тавараў адбываецца, перш за ўсё, у экспартным накірунку, але ж год за годам павялічваецца і ўзрост імпарту такіх тавараў. Праз гэта былі прынятыя значныя меры ў сферы абароны правоў на аб'екты ІУ, сярод якіх найбольш значнымі можна лічыць працэдуры «абарона Ex Officio» і «абарона па запыце». Кантроль выканання правоў ІУ ажыццяўляецца як на мытнай мяжы, так і на ўнутраным рынку КНР, сістэма абароны каторага нацэлена на спыненне абароту падробленай прадукцыі. Прымяняецца і міжнародны прынцып вычарпання правоў ІУ, абмежаванні не распаўсюджваюцца на тавар з такім самым таварным знакам, але ж выраблены правамерна, таму для ўпарадкавання паралельнага імпарту былі ўведзеныя ўдакладняючыя патрабаванні да кожнага асобнага тавару [1]. Дзеля процідзеяння абароту фальсіфікаванай прадукцыі ў КНР выкарыстоўваецца сістэма абавязковай сертыфікацыі прадукцыі, таксама створана добраахвотная сертыфікацыя. За парушэнне заканадаўства ў сферы ІУ прадугледжаны розныя пакаранні, у тым ліку адміністрацыйныя штрафы, канфіскацыя партый тавараў ды атрыманых даходаў і крымінальнае пакаранне.

Трэнд апошніх гадоў – гэта ўзмацненне штрафных і судовых інструментаў, якія ўжываюцца ў дачыненні да парушальнікаў правоў ІУ. Асаблівая ўвага надаецца парушэнням у высокатэхналагічных галінах эканомікі.

Так, паводле справаздач аб працы Вярхоўнай народнай пракуратуры ды Вярхоўнага народнага суда, у перыяд 2018-2022 гг. істотна ўзрасла колькасць спраў, якія разглядаюцца судовымі органамі Кітая ў катэгорыі спрэчак аб правах ІУ у сферах сувязі 5G, новых крыніц энергіі, новых матэрыялаў ды вытворчасці высокатэхналагічнага абсталявання. Пры гэтым разгледжана больш за 2,19 млн спраў аб інтэлектуальнай уласнасці (на 221,1% больш, чым за папярэдні пяцігадовы перыяд), а сума кампенсацый, якія прысуджаюцца па справах аб падобных парушэннях вырасла на 153% адносна 2018 г.). Пры гэтым большасць такіх судовых спрэчак адбылася ў Пекіне, Шанхаі, правінцыі Гуандун (у тым ліку, у г. Гуанчжоу) і правінцыі Хайнань (у порце свабоднага гандлю) [2]. Дзеля разгляду спраў, звязаных з ІУ, на названых тэрыторыях былі заснаваны суды па інтэлектуальных правах (увогуле, у органах пракуратуры 29 правінцыйных рэгіёнаў краіны былі створаны падраздзяленні, каторыя спецыялізуюцца на разглядзе спраў аб такіх парушэннях).

За 2022 г. 13 000 асоб былі прыцягнутыя да адказнасці за парушэнне правоў на таварныя знакі, патэнты, камерцыйную тайну, парушэнне аўтарскіх правоў, што на 51,2% больш, чым у 2018 г. Каб адказаць на нарастаючыя негатыўныя тэндэнцыі, КНР актыўна фарміруе механізм паскоранай і даволі скаардынаванай абароны правоў на аб'екты ІУ. Так, за год было створана 10 нацыянальных цэнтраў такой абароны (у тым ліку, паскоранай), якія паспелі разгледзець больш за 71 тыс. спраў [3]. Акрамя таго, працягвае дзейнасць 12 анлайн-платформ аказання дапамогі з абаронай правоў на аб'екты ІУ у Кітаі (колькасць карыстальнікаў за год – амаль 3 млн чалавек).

Калі разглядаць сітуацыю ў Еўрапейскім саюзе (далей – ЕС, Еўразвяз), трэба адзначыць, што мытныя плацяжы, як правіла, ўсталёўваюцца сукупнасцю абавязковых выплат, якія выстаўляюцца мытнымі органамі за тавары, што ўвозяцца з трэціх краін і выпускаюцца ў свабоднае абарачэнне на мытнай тэрыторыі ЕС. Каб гэтыя тавары знаходзіліся ў вольным звароце ў ЕС, пры падачы мытнай дэкларацыі неабходна заявіць аб мытнай працэдуры (выпуск у свабоднае абарачэнне), выплаціць падаткі, установленыя як заканадаўствам ЕС, так і нацыянальнымі нарматыўна-прававымі актамі – увазная мытная пошліна (памер залежыць ад самога тавару, яго мытнага кошту, колькасці, краіны паходжання), падатак на дадатковую вартасць, антыдэмпінгавая і / або кампенсацыйная пошліна, акцызы (увоз алкаголю, тытуню або паліва). Парадак ўстанаўлення і прымянення такіх плацяжоў (у тым ліку, парадак выплаты, адтэрміноўкі, вяртання) устанаўліваюцца нарматыўнымі прававымі актамі Еўразвязу, што

забяспечваюць прымяненне адзіных мытных пошлін ва ўсіх краінах-удзельніцах ЕС.

Кантрафактныя тавары нясуць шкоду рэпутацыі добрасумленных вытворцаў і пагаршаюць рынкавую канкурэнцыю, значна памяншаюць аб'ём фінансавання, які выдаткоўваецца дзяржавай на даследаванні і грамадскія інавацыі. Тавары масавага спажывання (кашалькі і сумкі), сталі катэгорыямі, што часцей за ўсё трапляюць пад мытныя забароны. Самыя распаўсюджаныя ў Еўразвязе катэгорыі кантрафактнай прадукцыі (упакоўкі ды носьбіты інфармацыі) вырабляюцца ў Кітаі, Грэцыі, Ганконгу і Турцыі і паступаюць марскім альбо аўтамабільным транспартам часцей за ўсё невялікімі партыямі [4].

Аднак асабліва сур'ёзную пагрозу для здароўя і бяспекі грамадзян ЕС ўяўляюць падробленыя лекі, прадукты харчавання, касметыка і бытавая тэхніка. Падробкі лекаў і санітарных вырабаў часцей за ўсё вырабляюцца ў антысанітарных умовах некваліфікаванымі работнікамі і могуць утрымліваць небяспечныя таксічныя інгрэдыенты. Пандэмія COVID-19 узмацніла павелічэнне вытворчасці і продажу некаторых нелегальных і падробленых медыцынскіх і санітарных вырабаў, пагоршыўшы пры гэтым пагрозу з боку злачынстваў у сферы інтэлектуальнай уласнасці, у тым ліку падробленых пестыцыдаў, якія нясуць сур'ёзную пагрозу экалагічнай бяспецы ЕС, бо яны забруджваюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі на працягу доўгага часу, а дадатковыя рызыкі звязаны з няправільным захоўваннем і знішчэннем хімічных прадуктаў. Што тычыцца фальшывых цацак, электронікі і аўтазапчастак для транспарту, то яны часта не праходзяць праверкі на бяспеку, не маюць папярэджанняў або рэкамендацый на ўпакоўках, а некаторыя прылады, напрыклад тэлевізійныя прыстаўкі, могуць перагравацца і выклікаць электрычныя непаладкі.

Распаўсюджаны (згодна са справаздачай кампаніі DNA) у ЕС фабрыкі па вытворчасці кантрафактных цыгарэт, у тым ліку, у Бельгіі, Літве, Польшчы, Славакіі, Ірландыі, Германіі, Нідэрландах і Францыі, а таксама Італіі. Паводле інфармацыі, сабранай Еўрапейскай камісіяй, тытунёвыя вырабы паступаюць у асноўным з канала duty free (да 43,8%) і Усходняй Еўропы і Балкан (да 20%) [5]. Часцей за ўсё гэта абумоўлена рынкам прызначэння і розніцай ў цэнах.

Найбольшую цікавасць для злачынцаў уяўляюць і інавацыйныя тавары, што выпрабляюцца малымі і сярэднімі прадпрыемствамі, бо яны адчувальна запатрабаваныя ў асяроддзі спажыўцоў. Пры гэтым найбольш часта мэтай з'яўляюцца электрычнае абсталяванне і электроніка, адзенне і модныя тавары, парфумерыя і касметыка, а таксама цацкі і гульні.

Даволі папулярнай формай спынення кантрафакту прадукцыі малых і сярэдніх прадпрыемстваў (далей – МСП) у ЕС адносна абароны правоў на аб'екты ІУ стала адпраўка апавяшчэнняў аб выдаленні незаконнай інфармацыі Інтэрнэт-пляцоўкам, на якіх яна змяшчаецца [6]. Істотныя парушэнні правоў ІУ з'яўляюцца крытычнымі для існавання саміх МСП, што пацвярджае і статыстыка EUIPO, згодна з якой МСП, інтэлектуальная ўласнасць якіх была парушаная, маюць на 34% больш нізкія шанцы на выжыванне, чым МСП, якія не сутыкаліся з падобным.

Кантроль за перамяшчэннем кантрафакту праз мяжу Еўразвязу ажыццяўляецца мытнікамі і наглядчымі органамі з ужываннем адзінай сістэмы кіравання рызыкамі. Шляхам аналізу электроннай мытнай дэкларацыі ўзнікае магчымасць з агульнага патоку прадукцыі, якая ўвозіцца, аператыўна выбраць тавары, што знаходзяцца ў групе рызыкаў і ў далейшым правесці дадатковыя праверкі. Для найбольш адчувальных тавараў (асобныя віды прадукцыі лёгкай прамысловасці ды чорнай металургіі) была усталявана сістэма ліцэнзавання і атрымання дазволаў на ўвоз. Прымяняецца таксама і знішчэнне партый фальсіфікаванай і кантрафактнай прадукцыі ды сур'ёзная адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за такія правапарушэнні (сістэма санкцый і штрафаў вызначаецца кожнай краінай самастойна).

Створана агульная сістэма ЕС па абароне таварных знакаў, патэнтаў і прамысловых узораў, што нівеліруе рызыкі для праваўладальніка, згодна з якой рэгістрацыя таварнага знака дазваляе цалкам забараніць далейшы абарот тавараў, якія ім маркіруюцца, нават у выпадку змены або пагаршэння іх якасці. На мяжы Еўразвязу па заяве праваўладальніка альбо пры падазрэнні мытных органаў адносна нелегальнасці такой прадукцыі, яна канфіскуецца, апасля можа быць знішчана. Пры выяўленні вытворчасці кантрафакту ў прамысловых маштабах, прымяняюцца меры па крымінальнаму пераследу.

Еўрапейскія меры тэхнічнага рэгулявання базіруюцца на механізмах маркіроўкі ды ацэнкі адпаведнасці, сістэмах сертыфікацыі тавараў [7]. Нагляд за рынкам і кантроль прадукцыі з трэціх краін – гэта прыярытэты для прадухілення незаконнага абароту прамысловай прадукцыі на ўнутраным рынку. Што тычыцца нацыянальных органаў, яны кантралююць рынкі на прысутнасць небяспечных прадуктаў і, як правіла, займаюцца непасрэднай бяспекай спажыўцоў. За вытворчасць фальсіфікаванай прадукцыі і незаконнае маркіраванне тавараў знакам CE на вытворцу накладаецца буйны штраф, а прадукцыю канфіскуюць з абароту. У некаторых выпадках можа ўсталёўвацца крымінальная адказнасць.

Вельмі паказальна прымяненне сістэмы аператыўнага апавяшчэння пра небяспечныя спажывецкія тавары (RAPEX) у рамках Еўразвязу, якая дазваляе ажыццяўляць аператыўны абмен інфармацыяй наконт мер, што прынятыя для прадухілення ды абмежавання выкарыстання адносна падазронай прадукцыі, кантраляваць гандлёвыя адносіны, збіраць інфармацыю аб нядобрасумленных пастаўшчыках і адсочваць меры, якія сёння прымаюцца дыстрыб'ютарамі ці вытворцамі на добраахвотнай аснове.

Такім чынам, для процідзеяння экспартнага (у апошнія гады таксама і імпартнага) перамяшчэння кантрафакту ў КНР прынятыя меры, сярод якіх найбольш значнымі можна лічыць працэдуры «абарона Ex Officio» і «абарона па запыце». Кантроль выканання правоў ІУ ажыццяўляецца на мытнай мяжы і на ўнутраным рынку (для ўпарадкавання паралельнага імпарту былі ўведзеныя ўдакладняючыя патрабаванні да кожнага тавару). Шырока выкарыстоўваецца сістэма абавязковай і добраахвотнай сертыфікацыі прадукцыі. Сфарміраваныя ў ЕС меры (Сістэма стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці і Адзіная сістэма апавяшчэння спажыўцоў і ўпаўнаважаных органаў) дазваляюць адсочваць тавары, што не адказваюць патрабаванням якасці і бяспекі і канфіскоўваць іх са звароту. Адзіная сістэма аховы ІУ, устанаўленне высокай меры адказнасці і знішчэнне партый кантрафакту мытнымі органамі даволі эфектыўныя, таму маглі б выкарыстоўвацца таксама для пабудовы сістэмы абароны рынку ЕАЭС ад кантрафактнай прадукцыі.

## Библиографический список


1. Анализ международной практики защиты внутреннего рынка от незаконного оборота промышленной продукции [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eurasiancommission.org/ – Дата доступа: 22.01.2024.
2. Intellectual Property Crime Threat Assessment 2022 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.europol.europa.eu/cms/sites/default/files/documents/Report.%20I ntellectual%20property%20crime%20threat%20assessment%202022_2.pdf. – Дата доступа: 26.01.2024.
3. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в ЕАЭС за 2022 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://eec.eaeunion.org/upload/medialibrary/6dc/ Otchet-PPP-za-2022-god.pdf . – Дата доступа: 21.01.2024.

4. *Жерягин, С. А.* Особенности правового регулирования рынка интеллектуальной собственности Европейского союза и Евразийского экономического союза на региональном и национальном уровне / С. А. Жерягин / / проблемы экономики и юридической практики. – 2016. – №5. – С. 161-166.

5. Contrabbando di sigarette, in fumo 10 miliardi di imposte nella Ue [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.il-sole24ore.com/art/co ntrabbando-sigarette-fumo-10-miliardi-imposte-ue-AEVJrYfE?refresh_ce=1. – Дата доступа: 27.01.2024.

6. *Леанович, Е. Б.* Международная охрана интеллектуальной собственности на современном этапе глобализации: монография / Е. Б. Леанович. – Saarbrucken: LAB publishing, 2011. – 95 с.

7. Направления совершенствования таможенной защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в рамках ЕАЭС [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ipcmagazine.ru/legal-issues/directions-for-improving-customs-protecti on-of-intellectual-property-rights-within-the-eaeu. – Дата доступа: 25.01.2024.